

# МЫ і ЧАС

ГАЗЕТА ВДУ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА

№ 12 (272)
АЎТОРАК,
28 ЧЭРВЕНЯ
2016 ГОДА

**НАВІНЫ, ПАДЗЕІ, ФАКТЫ**

## УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД АДБЫЎСЯ

V Усебеларускі народны сход прайшоў 22-23 чэрвеня ў Мінску. Удзельнікамі мерапрыемства сталі 2,5 тысячы чалавек: кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый, ваеннаслужачыя, прадпрымальнікі, пенсіянеры, рабочыя, супрацоўнікі СМІ і сацыяльна-культурнай сферы, студэнты...

Паглядзець прамую відэатрансляцыю сходу па тэлебачанні змаглі грамадзяне нашай краіны падчас яго адкрыцця, а вечарам – у запісе.

У адной з аўдыторый нашага ўніверсітэта таксама сабраліся прадстаўнікі рэктарата, загадчыкі аддзелаў і кафедраў, выкладчыкі, каб паназіраць за работай форуму. Пасля заканчэння трансляцыі прысутныя абмяняліся думкамі. У прыватнасці, старшыня Савета ветэранаў універсітэта, дэлегат IV Усебеларускага народнага сходу Васіль Мікалаевіч Баранок адзначыў:

«Народны сход – гэта сведчанне дэмакратыі і народаўладдзя, якое ўжо стала добрай традыцыяй. На сходзе падводзяцца вынікі пяцігадовага жыцця краіны і вызначаюцца перспектывы яе далейшага развіцця.

За гэты час многае было зроблена ў інавацыйным развіцці рэспублікі, у сферах прамысловасці, медыцыны, адукацыі, сельскай гаспадаркі. Я ўпэўнены, што мы стаім на парозе вялікага эканамічнага ўздыму, але яшчэ шмат чаго трэба зрабіць для таго, каб пераадолець усе перашкоды, якія нас чакаюць на шляху. Нездарма ў сваёй прамове падчас адкрыцця сходу Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пераадолець цяжкасці можна толькі разам».

**УЛАСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ.**

## ГАЛОЎНАЕ СВЯТА КРАІНЫ

Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь грамадзяне нашай краіны будуць адзначаць, як заўсёды, трэцяга ліпеня. Першапачаткова Днём Незалежнасці лічылася 27 ліпеня, бо ў гэты дзень у 1990 годзе Вярхоўным Саветам БССР была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. Так было да 1996 года, калі на рэспубліканскім рэферэндуме большасць беларусаў выказалася за перанос даты святкавання Дня Незалежнасці.

З таго часу трэцяга ліпеня сталі адзначаць не толькі як гадавіну вызвалення Мінска, але і як Дзень Незалежнасці.

На галоўнае свята беларусаў у кожным куточку нашай сінявокай Радзімы збяруцца тысячы людзей, каб ушанаваць памяць тых, хто ў далёкім 1944 годзе вызвалілі нашу зямлю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і парадавацца сённяшняму мірнаму дню. Разам з беларусамі будуць святкаваць Дзень Незалежнасці і госці, якія прыедуць з бліжняга і дальняга замежжа.

Па традыцыі студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі нашага ўніверсітэта таксама прымуць удзел у святкаванні Дня Незалежнасці.

**УЛАСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ.**

## ВАЖНАЕ МЕРАПРЫЕМСТВА

На пачатку чэрвеня ў Мінску прайшло пасяджэнне Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі і Рэспубліканскага Савета ветэранаў працы ў гэтай галіне.

Дэлегацыю ад Віцебскай вобласці ўзначальваў старшыня Віцебскага абласнога камітэта прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі А.С. Суханаў. Нашу ВНУ прадстаўляў старшыня Савета ветэранаў універсітэта В.М. Баранок.

Для дэлегатаў была падрыхтавана насычаная праграма. У першы дзень яны наведалі Цэнтр тэхнічнай і мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Фрунзенскага раёна «Зорка».

На другі дзень удзельнікі мерапрыемства зранку наведаліся ў гімназію №13 г. Мінска, затым адбылося адкрытае пленарнае пасяджэнне, на якім выступілі старшыня Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі А.А. Бойка, старшыня Рэспубліканскага Савета ветэранаў працы ў гэтай галіне Я.А. Трахімовіч, старшыня камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама М.У. Мірончык і інш. А ўвечары ўсіх іншагародніх чакалі цікавая аглядавая экскурсія па Мінску і канцэртная праграма навучэнцаў, педагогаў і ветэранаў педагагічнай працы ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры.

У апошні дзень мерапрыемства дэлегаты ўсклалі кветкі да памятнага знака на месцы дыслакацыі ў 1944 годзе Беларускага штаба партызанскага руху, наведалі сярэднюю школу №51 г. Мінска, дзе адбылася прэзентацыя праекта «Электронная школа», і падвялі вынікі адкрытага пасяджэння.

Прыемна, што падчас мерапрыемства прадстаўнік нашага ўніверсітэта Васіль Мікалаевіч Баранок быў узнагароджаны юбілейным медалём «Праца» Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

**УЛАСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ.**

## ПРЫМІЦЕ ВІНШАВАННЕ

Першага ліпеня Аршанскаму каледжу споўніцца 105 год. Гэта знакавая дата ў гісторыі навучальнай установы, што славіцца сваімі выпускнікамі, якія плённа працуюць на ніве адукацыі не толькі нашага рэгіёна, але і рэспублікі.

Паважаныя Анатоль Аляксандравіч, выкладчыкі, супрацоўнікі і навучэнцы Аршанскага каледжа! Прыміце шчырыя віншаванні з гэтай нагоды. Радасна ўсведамляць, што гэтую дату вы сустракаеце з высокімі паказчыкамі ў вучобе, навуцы, спартыўным жыцці вашай навучальнай установы. Каледж рыхтуе сапраўдных прафесіяналаў сваёй справы, выкарыстоўваючы інавацыйныя тэхналогіі і пастаянна ўдасканальваючы змест навучання. Высокапрафесійны калектыў педагогаў і супрацоўнікаў каледжа ўкладае ў кожнага навучэнца сваю душу, веды, перадае вопыт, выхоўвае сапраўдных грамадзян, патрыётаў нашай Радзімы.

Жадаем вам упэўнена глядзець у будучыню, рэалізоўваць самыя смелыя планы, захоўваць і шанаваць традыцыі, якія склаліся за гэтыя гады ў вашай навучальнай установе. Шчасця вам, дабрабыту, здароўя, аптымізму.

**РЭКТАРАТ ВДУ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА.**

**У АБ'ЕКТЫВЕ**

## КАЛІ ФАКУЛЬТЭТ – АДНА СЯМ'Я



**На здымку:** *студэнты-выпускнікі юрыдычнага факультэта – актывісты ў навуковым і культурна-грамадскім жыцці ўніверсітэта.* **Фота Настассі НАРКЕВІЧ.**

Праз некалькі дзён выпускнікі нашай альма-матар атрымаюць доўгачаканыя дыпломы і ўжо ў жніўні прыступяць да працы. Чакаючы гэты дзень, безумоўна, нават самыя ўпэўненыя ў сваіх ведах маладыя спецыялісты будуць хвалявацца. Адна справа – вучоба, залікі, экзамены, аднагрупнікі, з якімі вучыліся пяць гадоў, другая – новы калектыў са сваімі парадкамі, традыцыямі, кіраўніком (крый божа, грымза ці тыран!) і праца, якую патрэбна выконваць добрасумленна і бездакорна.

Упэўнена, нашы выпускнікі будуць сапраўднымі спецыялістамі – адказнымі, руплівымі, ініцыятыўнымі. У тым ліку і хлопцы і дзяўчаты юрыдычнага факультэта. Яны і адаптуюцца да новых умоў без цяжкасцей, бо за гады вучобы мелі грунтоўную практыку. Толькі на працягу бягучага навучальнага года студэнты, якія займаюцца ў Лабараторыі прававога інфармавання (загадчык – дацэнт А.А. Сухараў), пракансультавалі 47 чалавек, 13 асобам былі дадзены адказы на іх пісьмовыя звароты. Акрамя гэтага, у школах было праведзена 80 заняткаў, на якіх прававыя веды атрымалі 1500 навучэнцаў. Адным словам, на факультэце створаны ўсе ўмовы для развіцця кожнага студэнта.

І дзе б ні працавалі выпускнікі юрыдычнага факультэта, яны сябе пакажуць толькі са станоўчага боку: сумленнымі людзьмі, высокакваліфікаванымі спецыялістамі, выдатнымі арганізатарамі. І гэта дзякуючы кампетэнтным выкладчыкам і спагадліваму кіраўніцтву дэканата, у тым ліку намесніку дэкана па выхаваўчай рабоце Святлане Міхайлаўне Аляксеенка – творчай, руплівай і адказнай жанчыне.

Са Святланай Міхайлаўнай я пазнаёмілася мінулай восенню на абласным этапе рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года-2015», што праходзіў у Наваполацку. Намеснік дэкана ўзначальвала групу студэнтаў, якая дапамагала прадстаўніцы юрыдычнага факультэта Таццяне Чудзікавай годна выступіць на конкурсе. Гледзячы на гэтую апантаную і ініцыятыўную жанчыну, я адразу зразумела, што ёй усё пад сілу. Умее С.М. Аляксеенка працаваць з моладдзю, і студэнты да яе цягнуцца.

**(Заканчэнне на 2-й стар.)**

# ЮРИДИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ: ЗАКОННОСТЬ, СПРАВЕДЛИВОСТЬ, ПРОФЕССИОНАЛИЗМ

**– Александр Александрович, поступить на ваш факультет всегда было непросто. Чем же привлекает юрфак молодых людей?**

– Да, у нас традиционно большой конкурс, поскольку профессия юриста всегда и везде востребована. И когда я встречаюсь со студентами, то часто им говорю, что юридический факультет – это особый, интеллектуальный, элитный факультет. Наши студенты должны иметь не только отличные профессиональные знания, но и твердую гражданскую позицию, высокие духовно-нравственные качества. Все это будущим юристам необходимо, ведь они станут на защиту прав людей, общества, будут представлять государство. Приятно отметить, что наши выпускники – это знающие, принципиальные, ответственные государственные служащие, за работу которых нам не стыдно.

**– Чтобы стать хорошим специалистом, нужны не только теоретические знания, но и практические навыки. В каких организациях ваши студенты их приобретают?**

– Мы заключили более двадцати договоров с областными и городскими юридическими организациями, чтобы студенты могли на практике увидеть то, о чем мы говорим на лекциях. Наши ребята присутствуют на судебных заседаниях, видят работу адвокатов, судей, прокуроров и т.д.

**– В начале беседы Вы отметили, чтобы стать студентом юридического факультета, нужно хорошо сдать ЦТ. Какой проходной балл был в прошлом году?**

– Конкурс на бюджетные места очень большой: поступают те юноши и девушки, которые набрали более 300 баллов. На внебюджетные места претендуют те абитуриенты, у кого около 200 баллов. Бюджетные места ограничены. Но те студенты, которые учатся на внебюджетной основе и показывают высокие результаты в учебе, участвуют в общественной жизни факультета и университета, могут рассчитывать на снижение оплаты на 20%, 40%, 60% и перевод на бюджет.

**– Александр Александрович, расскажите, пожалуйста, о преподавателях вашего факультета?**

– На факультете шесть профессоров, три доктора юридических наук, восемь кандидатов юридических наук. Коллектив преподавателей, которые работают непосредственно на факультете, состоит из 34 человек. Отдельные дисциплины студентам читают те, кто имеет богатый практический опыт, – сотрудники МВД, прокуратуры, адвокатуры. Однако укрепление кадрового потенциала – наша главная задача. Все наши преподаватели учатся в магистратуре, аспирантуре, докторантуре, являются соискателями. Так, недавно диплом кандидата юридических наук получил Павел Валентинович Гурщенков.

**– Наверняка ваш факультет существует не автономно, а взаимодействует с подобными факультетами белорусских и зарубежных вузов.**

– Да, это так. К примеру, мы поддерживаем тесные связи с коллегами Смоленского гуманитарного университета: пишем совместные работы, проводим исследования. Профессор Л.В. Виницкий, заслуженный юрист России, приезжал к нам читать лекции по уголовному процессу. У нас сложились хорошие отношения и с коллегами из Санкт-Петербургской юридической академии. С ними мы проводим совместные конференции. С Российской правовой академией (г. Москва) также поддерживаем связь. Е.В. Белякова, как куратор Лаборатории правового информирования, постоянно ездит за границу, чтобы обмениваться опытом, повышать квалификацию у ведущих специалистов Запада. 30 мая и 7 июня у нас прошли он-лайн-телемосты с юридическим факультетом Новгородского государственного университета имени Ярослава Мудрого и Уральским государственным юридическим университетом Российской Федерации. С последним наш вуз заключил договор о сотрудничестве.



***Юридический факультет нашего университета относительно молодой. Он был создан в октябре 1998 года. За этот период подготовлено более трех тысяч высококвалифицированных юристов, среди которых – заместитель министра МВД Республики Беларусь, начальник ГАИ Витебского облисполкома, заместитель начальника ИМНС по Витебской области, 40 адвокатов, 20 судей, 7 начальников РОВД и др. Возглавляет факультет кандидат философских наук, доцент А.А. Бочков, который любезно согласился ответить на вопросы.***

**– Какие лаборатории действуют на юридическом факультете?**

– У нас на факультете две лаборатории: Лаборатория правового информирования и Криминалистическая лаборатория. Используем мы также лаборатории УВД прокуратуры. Особо гордимся новой Криминалистической лабораторией. Я благодарен ректору А.В. Егорову, доценту кафедры уголовного права и уголовного процесса Т.Ф. Дмитриевой и заведующему лабораторией О.Ю. Федотовой, которые помогли ее создать. Лаборатория получилась современная: она оснащена ноутбуками, установлено новое программное обеспечение. Для проведения учебных следственных действий при Криминалистической лаборатории создан полигон в виде типовой жилой квартиры. Студенты могут посмотреть, как проводятся обыск, изъятие, имеется для таких действий и специальное оборудование. В будущем хотели бы приобрести полиграф (детектор лжи).

**– Судя по Вашим ответам, на факультете действительно интересно учиться. Учеба учебой, а как проводят студенты свой досуг?**

– Ребята активно участвуют в различных концертах, фестивалях, конкурсах, которые проходят на факультете, в университете и городе. Вызывает интерес у студентов конкурс ораторского мастерства «Цицероний», во время которого они учатся логически излагать свои мысли, аргументировать, убеждать, умело вести полемику.

Многие из студентов профессионально занимаются спортом. В прошлом и в этом году ребята заняли третье место в ежегодной универсиаде, до второго места им не хватило одного очка.

Юрист должен быть хорошо подготовлен физически. Для этого в университете созданы все условия.

**– Александр Александрович, вступительная кампания в самом разгаре. Скажите, пожалуйста, на какие специальности будет производиться набор?**

– В этом году на дневное отделение мы будем набирать абитуриентов на специальности «Правоведение» (специализации «Хозяйственное право», «Судебно-прокурорско-следственная деятельность») и «Экономическое право». На заочную форму обучения мы приглашаем абитуриентов на специальность «Правоведение» (специализации «Хозяйственное право» и «Судебно-прокурорско-следственная деятельность»).

Пользуясь случаем, я приглашаю не только абитуриентов, но и студентов нашего и других учебных заведений, а также выпускников вузов, их родителей и знакомых поступать на наш факультет.

**– Спасибо за беседу.**

**Ольга ВАЛЕРОСО, студентка 4 курса ФлФ.**

# КАЛІ ФАКУЛЬТЭТ – АДНА СЯМ'Я



**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Святлана Міхайлаўна проста «запальвае» сваім аптымізмам, ёй нельга адмовіць у просьбе ці прапанове, заўжды хочацца дапамагчы. І, канешне, хлопцы і дзяўчаты ёй дапамагаюць. Многія мерапрыемствы, якія праходзяць на факультэце (а іх нямала), ладзяцца сумесна з лідарамі БРСМ, студэнцкага савета і прафсаюзнага камітэта студэнтаў.

– У нас цудоўная творчая каманда, – адзначае Святлана Міхайлаўна, – і большасць таленавітых студэнтаў гэтай каманды – выпускнікі. Яны былі першымі ў навуцы, вучобе, спорце. Узяць, напрыклад, Дар'ю Кручкову. Гэта генератар ідэй пятага курса, флагман Лабараторыі прававога інфармавання. Дзяўчына актыўна займалася арганізацыяй культурна-грамадскага жыцця факультэта. Разам з Глебам Пусянковым Дар'я была пераможцай за лепшы даклад на міжнароднай канферэнцыі «Юрыдычная клінічная адукацыя», якая праходзіла ў БДУ. Дзмітрый Гулідаў – галоўны спартсмен нашага факультэта. Ён рыхтаваў да спаборніцтваў жаночую зборную каманду па валейболе. Філіп Куракін стаяў ля вытокаў дэбат-клуба на нашым факультэце. Філіп, Павел Прысь і Антон Іванчыкаў – стваральнікі мабільнага дадатку «Завітай-ка», які хлопцы прэзентавалі на конкурсе сацыяльных праектаў Social Weekend у Мінску і на І Рэспубліканскім форуме маладзёжнага стартап-руху ў Пінску. Дзмітрый Царабулёў – спартсмен, удзельнік усіх спартакіяд. Іван Сухавеяў – член маладзёжнага атрада аховы правапарадку, што дзейнічае пры першаснай арганізацыі БРСМ універсітэта. Можна бясконца называць імёны і прозвішчы тых студэнтаў, якія робяць усё для таго, каб факультэт быў адным з найлепшых у нашай ВНУ. Гэта і старшыня студсавета Таццяна Чудзікава, і сакратар БРСМ факультэта Стас Мільяненка, і старшыня прафкама студэнтаў Антон Іванчыкаў...







**На здымках:** старшыня студсавета ЮФ Таццяна Чудзікава, сакратар БРСМ факультэта Стас Мільяненка, старшыня прафкама студэнтаў ЮФ Антон Іванчыкаў – актыўныя памочнікі намесніка дэкана па выхаваўчай рабоце С.М. Аляксеенка.

Нельга не ўзгадаць і тыя конкурсы ды фестывалі, у якіх нашы юнакі і дзяўчаты сябе праявілі. Так, у агульнаўніверсітэцкім конкурсе «Лепшая група ВДУ-2016» 31-я група нашага факультэта перамагла з праектам «Стопспайс!». Таццяна Чудзікава заняла трэцяе месца на абласным этапе рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года-2015». Ва ўніверсітэцкім конкурсе «Міс ВДУ-2016» тытул першай віцэ-міс атрымала Ганна Цішурова. Студэнт першага курса Валерый Палітыка стаў пераможцам у намінацыі «Містар фота», а Аляксандр Гарошка – у намінацыі «Містар мужнасць» у конкурсе «Містар ВДУ-2016». У фестывалі мастацкай творчасці студэнтаў «Хіт-парад-2016» наша каманда заняла трэцяе месца і атрымала спецыяльны прыз журы.

Святлана Міхайлаўна, дарэчы, таксама выпускніца ЮФ нашага ўніверсітэта, з гонарам прызнаецца, што юрыдычны факультэт – гэта адна вялікая дружная сям'я.

– Мы разам ладзім вечарыны, дыскатэкі, гуляем у «Мафію», арганізоўваем культурна-спартыўныя паходы і інш. Адным словам, жыццё на факультэце кіпіць.

Толькі шкадуе Святлана Міхайлаўна, што таленавітыя выпускнікі пакідаюць факультэт, і адначасова шчыра радуецца, што яны атрымалі грунтоўныя веды і ніколі не згубяцца ў жыцці.

**Настасся НАРКЕВІЧ.**

# СТУДЕНТ XXI ВЕКА

Не так уж часто можно встретить людей, которые могут быть талантливыми во всем. Но мне посчастливилось познакомиться с таким человеком, когда я заглянула на кафедру русского языка как иностранного.

Уютное помещение, мягкие и удобные кресла. Напротив меня сидит парень с доброжелательной улыбкой, необычайно лучистыми и умными глазами. Это студент четвертого курса юридического факультета Эзиз Ораметов. «Уникальный студент», – так мне его представила преподаватель кафедры Наталья Михайловна Татаринова. Позже я убедилась в правдивости такой необычной характеристики.

Еще в Туркменистане, будучи школьником, Эзиз привлекал внимание сверстников и взрослых многогранностью своей натуры. Было чему удивиться и позавидовать: с поразительной легкостью он занимал призовые места на республиканских олимпиадах, с неменьшим успехом выступал на состязаниях по шахматам, успешно организовывал и проводил культурно-общественные мероприятия. При этом активная деятельность не мешала ему быть отличником. После окончания школы Эзиз решил связать свою жизнь с архитектурой. Но течение жизни часто меняет свое направление: судьба привела Эзиза к дверям юридического факультета нашего университета.

Новоиспеченный студент с воодушевлением принялся грызть гранит науки. Изучая сложный юридический материал, Эзиз преобразовывал его в схемы, таблицы и рисунки-ассоциации, тем самым облегчая процесс обучения не только себе, но и однокурсникам, которые всегда охотно обращались за помощью к товарищу. Для более глубокого понимания материала по курсу «Общая теория права» студент начал работать над созданием мини-словаря: выписывал


На снимке: Н.М. Татаринова с Эзизом Ораметовым.

термины, находил их значения во всевозможных контекстах и переводил на родной язык. Эти записи увидела Наталья Михайловна и предложила использовать их на занятиях с туркменскими студентами. Импровизированный словарь юноши стал весьма полезным и приобрел широкую популярность среди студентов старших курсов. Вскоре Сергей Михайлович Яковлев, заведующий кафедрой русского языка как иностранного, предложил Наталье Михайловне вместе с одаренным студентом издать словарь. Целый год они трудились над созданием незаменимого теперь помощника для студентов из Туркменистана.

«Тематический русско-туркменский словарь по курсу "Общая теория права"» – под таким названием в 2015 году в нашем университете появилось первое учебное пособие, автором которого является студент. Ребята, с нетерпением ожидавшие этого события, выкупали экземпляры, а от преподавателей поступали предложения заняться разработкой словарей по их дисциплинам. Эзиз успешно выступил на конференции «Молодость. Интеллект. Инициатива» и как автор учебного пособия занял почетное первое место. Юриспруденция не каждому под силу, но здесь Эзиз сполна реализовал себя. Изданием словаря не заканчивается перечень успешных дел этого талантливого, но очень скромного и тактичного студента. Он охотно предоставляет свою помощь в следственных делах, оказывает переводческие услуги в суде.

В чем же секрет успеха этого молодого человека? Ответ прост. По мнению Эзиза, студент должен видеть в преподавателе не образец и не предел совершенства, а конкурента. Только в таких условиях происходят развитие и совершенствование его личности.

«Уникальный студент», – вспомнила я слова, прозвучавшие в начале нашей встречи. Соглашусь с этим и уверенно дополню: это настоящий студент XXI века.

**Ирина МИКУЦКАЯ,**
**студентка 2 курса ФлФ.**

# КОГДА МЕЧТЫ СБЫВАЮТСЯ

Кристина Матвеева в этом году заканчивает юридический факультет нашего университета. Впереди девушку ждет работа в одной из прокуратур Витебской области. И Кристина такому распределению очень рада, ведь иметь звание и носить форму – это ее детская мечта.



За своей мечтой она и пришла в наш университет. С первых дней учебы Кристина зарекомендовала себя хорошей, перспективной студенткой: девушка училась на «отлично», активно участвовала в общественной и культурной жизни факультета. Такая старательность не могла быть незамеченной: уже после первого курса студентке снизили плату за обучение, а после второго – перевели на бюджетную форму обучения. На четвертом курсе Кристина Матвеева стала президентским стипендиатом.

Кристина оправдала доверие преподавателей и администрации вуза. Серьезно занялась научной работой, выбрав тему уголовной ответственности несовершеннолетних. Из 20 опубликованных студенткой за годы учебы научных статей 13 посвящены этой теме. Результаты научных исследований девушки внедрены в учебный процесс кафедры уголовного права и уголовного процесса.

Со своими научными докладами Кристина Матвеева неоднократно выступала на различных конференциях. Девушка также отправляла свои работы на республиканские конкурсы научных работ, в том числе по международному и спортивному правам; вместе с командой юридического факультета «Колибр 7,62» принимала участие в брейн-ринге и в республиканской олимпиаде по юридическим дисциплинам. Во время учебы Кристина сотрудничала с прокуратурой Витебского района.

Уже на днях Кристина получит диплом о высшем образовании, а совсем скоро ее ждет интересная работа, на которой она сможет применить полученные в вузе знания. И нет сомнений, что на первом рабочем месте девушка проявит себя только с лучшей стороны.

**Подготовила**
**Алеся ДУБРОВСКАЯ.**

# ВАЖНО БЫТЬ НУЖНЫМ

На юридическом факультете нашего университета науке уделяется большое внимание. Уже на первом курсе ребят привлекают к научной деятельности: студенты занимаются разработкой интересных тем, готовят публикации и участвуют в различных конференциях. Большая заслуга в этом, безусловно, преподавателей факультета, которые во вчерашнем школьнике могут рассмотреть перспективного юриста-теоретика. К таким преподавателям в первую очередь относится заведующий кафедрой истории и теории права Елена Францевна Ивашкевич. В этом учебном году под ее чутким руководством свои первые шаги в науку делали студенты 11-й группы Антон Ананенко и Наталья Даркович.



Наташа исследует вопросы, касающиеся охраны детства и материнства на национальном и международном уровнях. Антон выбрал тему гендерного равенства и законодательного закрепления его принципов. За год учебы студент принял участие уже в четырех научных конференциях.

«Мне всегда хотелось помогать людям, приносить пользу обществу. Поэтому я и выбрал юридический факультет, ведь здесь можно получить профессию, которая позволит стать на защиту человека, его прав, свобод и интересов», – отмечает юноша.

Наталья также с детства хотела получить юридическое образование, ведь многие ее родственники и знакомые работают в сфере юриспруденции. Девушка признается, что сначала учиться было непросто, но благодаря помощи одногруппников и товарищей со старших курсов, а также поддержке со стороны преподавателей быстро втянулась в учебный процесс.

«В будущем нам хотелось бы стать не только хорошими специалистами, но и оставаться настоящими людьми. Ведь быть человеком, несмотря на любые обстоятельства, – это самая главная профессия», – подытоживает беседу Антон.

**Александра**
**АЛЕКСАНДРОВА.**

# МОЙ ФАКУЛЬТЕТ – МОЯ СУДЬБА



Честно признаюсь: я собиралась поступать на экономический факультет. Но за три месяца до сдачи ЦТ решила, что буду юристом. Сама судьба благоволила мне в то время: впервые отменили профессиональное собеседование, которое нужно было проходить задолго до ЦТ, иначе я бы не успела.

Сегодня я уже заканчиваю второй курс и ни разу не пожалела о том, что учусь здесь. Атмосферу, царящую на юридическом факультете, невозможно передать словами: все мы одна большая семья, члены которой всегда помогают и поддерживают друг друга.

На нашем факультете интересно все: получать знания от самых лучших преподавателей, участвовать в научной жизни, применять теорию на практике и, конечно, уделять внимание досугу. К примеру, еще во время учебы в школе я несколько лет занималась хореографией. Не бросила танцевать и в университете, создав на базе юридического факультета танцевальный коллектив «UF dance». Его участники – творческие люди, всегда полные интересных идей и инициатив, не представляющие свою жизнь без танцев. Наш коллектив уже не раз выступал на сцене актового зала ВГУ, и, надеемся, мы успели запомниться и полюбиться зрителям.

**Виктория ВАСИЛЬЕВА,**
**студентка 2 курса**
**ЮФ.**

# ЭТО ВСЕ МНЕ ПРИГОДИТСЯ

Найти себя в сфере юриспруденции я мечтала с 9-го класса. Родители не были против, но, рассуждая, отмечали, что работать в Следственном комитете опасно, ведь приходится расследовать разного рода преступления, раскрывать дела, связанные с наркотиками, и т.д. Однако я поступила на юридический факультет, который открыл для меня множество перспектив в трудоустройстве – от прокуратуры до нотариата. Учиться здесь интересно. Я участвую в различных конференциях, публикую научные статьи, что позволяет мне более углубленно изучить некоторые юридические вопросы. Являюсь также членом Лаборатории правового информирования, которая действует на факультете. Одним словом, набираюсь опыта, что, безусловно, важно для будущего юриста. Помимо науки я занимаюсь спортом — кикбоксингом, который, на мой взгляд, имеет немаловажное значение в моей будущей профессии. Сейчас у меня первый разряд, готовлюсь получить разряд кандидата в мастера спорта. Знания основ самообороны, думаю, нужны каждой девушке, и при поступлении на службу в правоохранительные органы это огромный плюс.




**Светлана ЕРЁМЕНКО,**
**студентка 3 курса**
**ЮФ.**

# «А НА ЙВАНА СОНЦА ЙГРАЛА...»



Купалле ў народнай культуры беларусаў лічыцца магічным святам. Спрадвеку яно было прымеркавана да дня летняга сонцазвароту і святкавалася з 23 на 24 чэрвеня, але паступова перамясцілася з 6 на 7 ліпеня. З прыходам хрысціянства да часу летняга сонцазвароту была прымеркавана дата нараджэння Івана Хрысціцеля – Івана Прадцечы, Прарока і Хрысціцеля Гасподняга. У народзе гэтага святога звалі Іван Купала (той, хто пахрысціў (пакупаў) Хрыста). З цягам часу гэтыя два святы ў свядомасці народа зліліся ў адно, якое было напоўнена шматлікімі абрадамі і рытуаламі. Нездарма ў адной з песень пяецца: «Сёння Купалле, заўтра Ян».

Раніцай на Купалле ішлі ў лазню. Лічылася, той, хто на Купалле папарыцца, пазбавіцца ад усіх хвароб. Хворых людзей абавязкова клалі на крапіву-жыгучку і парылі зёлкамі. Калі ў гэты дзень не было магчымасці папарыцца ў лазні, ішлі да крыніцы. Пасля таго як кожны з дамачадцаў памые твар халоднай вадой, у крыніцу кідалі манету – «адкупляліся» ад хвароб.

На Купалле прырода буяла, русалкі вылазілі са сваіх схованак, а хлопцы і дзяўчаты шукалі пару.

Своеасаблівым абярэгам ад нячыстай сілы лічылі тое, што ў гэтую ноч нельга спаць. А таму позна ноччу ўсе вяскоўцы збіраліся разам і палілі вогнішча да самага досвітку. Да купальскага агню ставіліся ўважліва. На працягу ўсяго дня хлопцы сцягвалі старыя рэчы, бочкі, калёсы, ламачча, састарэлы посуд на спецыяльна абранае месца – каля вады (ракі або возера). Як толькі купальскае вогнішча разгаралася, пачыналіся гульні, карагоды, танцы і скокі, у якіх прымалі ўдзел і старыя, і малады. Скокі праз вогнішча былі абавязковымі, бо праз гэта чалавек «ачышчаўся» на ўвесь год, пазбаўляўся хвароб, мог загадаць самае патаемнае жаданне, якое спраўдзіцца толькі пасля таго, як ён перакочыць праз агонь.

Абавязковай умовай купальскага абраду было спальванне саламянага пудзіла, якое нагадвала жанчыну. Пудзіла падпальвалі і на спецыяльным плыце пускалі па вадзе. Затым пачыналі пускаць з пагоркаў прамасленыя падпаленыя колы, якія таксама трапляли ў ваду.

Дзяўчаты варажылі пра замужжа: пускалі па вадзе вяночкі. Калі вянок паплыў – чакай сватоў здалёк, калі прыстаў да берага – жаніх будзе тутэйшы, калі вянок патануў – жыццё дзяўчыны будзе недаўгавечным.

Бліжэй да ночы гаспадыні павінны былі засцерагчы ад нячыстай сілы сваю гаспадарку, хатнюю жывёлу, усіх дамачадцаў, бо верылі, што ў купальскую ноч ведзьмы злятаюцца на свой сход – шабаш і могуць зачараваць любога, адабраць у каровы малако, згубіць пасевы і г.д. Таму на парог хаты клалі крапіву-жыгучку, у дзвярах хлява прыстасоўвалі маладую асіну, якую высякалі ў лесе загадзя. Часцей за ўсё можна было бачыць, як у варотах мацавалі велікодную свечку, каб ніякі злыдзень не змог загаварыць сялянскую гаспадарку. Каровам на рогі чаплялі вянкі з лекавых раслін і галінак бярозы, абносілі чацвярговай соллю і запаленай грамнічнай свечкай.

З самай незвычайнай летняй ноччу звязана легенда пра самую незвычайную кветку – папараць. Смелыя і адчайныя ў гэты час ішлі ў лес, каб здабыць шчасце – знайсці папараць-кветку. Лічылася, той, хто яе знойдзе, стане празарліўцам, будзе разумець мову звяроў, птушак, а таксама валодаць таямніцамі скарбаў.

Як толькі пачынала ўзыходзіць сонейка, усе зноў збіраліся каля вады, каб убачыць, як яно «купаецца». Казалі так: «Гэтую гульню можа ўбачыць як узнагароду толькі той, хто бавіў купальскую ноч без сну і хто будзе глядзець на сонца не міргаючы». І толькі пасля таго, як сонейка ўзышло, людзі ішлі купацца самі. Верылі, што вада становіцца чарадзейнай, змывае грахі, пазбаўляе ад хвароб, робіць чалавека дужым.

**Паводле Янкі КРУКА і Аксаны КАТОВІЧ.**

В МИРЕ ИНТЕРЕСНОГО

# «ЗВЕЗДНОЕ НЕБО НАД НАМИ»

Так называлась открытая лекция, с которой в Витебской областной научно-технической библиотеке в рамках обучающего проекта «Наука вне себя» выступил доцент кафедры физики нашего университета, известный астроном В.А. Голубев.



На встречу с Владимиром Александровичем пришли более ста человек. Это школьники, студенты, работающая молодежь, родители с детьми, которые не только с удовольствием слушали лектора, но и задавали ему вопросы. Присутствующих интересовало многое: они с удовольствием рассуждали о внеземных цивилизациях, созвездиях и метеоритах.

Владимир Александрович в своем выступлении особое внимание уделил экзопланетам, а также созвездиям, звездам и планетам, которые видны на небе в конце весны – начале лета. А рассказывая о самых известных метеоритах и об опасностях, связанных с их падением, астроном показывал видеофрагменты документальных фильмов и даже давал подержать в руках кусочек настоящего метеорита, который упал в 1947 году в горах Сихотэ-Алинь и отсюда получил свое название – Сихотэ-Алиньский. Закончилась лекция тем, что на улице все желающие смогли в телескоп посмотреть на пятна на солнечном диске. Несмотря на то, что для этого пришлось стоять в очереди, эмоции у всех были только положительными.

А 9 мая всех любителей астрономии ждали в нашем университете. В планетарии вуза и на улице возле главного корпуса они могли понаблюдать в телескоп за прохождением Меркурия по диску Солнца.

**Анастасия БОЛТОВСКАЯ, выпускница гимназии №1 г. Витебска.**

ВЫПУСКНОЙ

# В ДОБРЫЙ ПУТЬ, БУДУЩИЕ ПЕДАГОГИ!

Праздник последнего звонка – важное событие в жизни каждого человека. Несомненно, в последние дни мая волновались и выпускники Полоцкого колледжа, ведь на всех педагогических специальностях здесь прошли последние звонки.



Учащиеся с гордостью отметили, что заканчивают престижное учебное заведение, где получили качественное образование и неоценимый жизненный опыт и где их обучал профессиональный коллектив преподавателей. На протяжении четырех лет учебы многие ребята успешно участвовали в городских, областных, республиканских и международных конференциях и олимпиадах, спортивных состязаниях, творческих фестивалях и конкурсах. Все это, безусловно, пригодится им в будущем.

Интересно и необычно провели свой праздник учащиеся группы 41Н специальности «Начальное образование». Они предложили зрителям представить, что их группа – это модельное агентство, в котором ведущий специалист (единственный юноша из 24 обучающихся) представлял прекрасных моделей – будущих учителей начальных классов. А в конце выступления ребята высказали слова благодарности педагогическому коллективу и всем сотрудникам колледжа, которые помогли им пройти интересный и нелегкий путь учебы.

А вот выпускники специальности «Дошкольное образование» решили провести праздник последнего звонка в уютном дворике учебного заведения, возродив тем самым давнюю традицию. Всех гостей мероприятия встречали украшенный воздушными шарами, цветами и плакатами дворик и дружная семья выпускников и их кураторов. Всего – семьдесят четыре человека.

Ребята показывали интересные музыкальные номера, вспоминали лучшие моменты студенческой жизни, рассказывали о том, как они полюбили колледж и как общежитие стало их вторым домом.

Нам, преподавателям, прощаясь с ребятами, всегда кажется, что каждый выпуск – самый лучший, а выпускники – самые уникальные и неповторимые. Так оно и есть. Ответственные, тактичные, добрые, коммуникабельные, красивые, умные выпускники 2016 года пойдут на свои первые рабочие места. Пусть же им сопутствует удача! А мы будем всегда рады видеть их в нашем колледже!

**Г. ЛАБЁНОК, преподаватель комиссии языка и литературы с методиками преподавания Полоцкого колледжа. Фото А. КАБЫЛКОВОЙ.**



ЮБИЛЯР

# ЛЮБИМОМУ ПРЕПОДАВАТЕЛЮ – САМЫЕ ТЕПЛЫЕ СЛОВА



Необычный вечер прошел в нашем колледже в конце учебного года. Талантливый педагог, преподаватель русского языка и литературы, отличник образования Республики Беларусь Ольга Арсентьевна Огородникова встретилась со студентами и коллегами.

Дело в том, что одна из интересных традиций нашего учебного заведения – это встречи в формате телепрограммы с Юлией Меньшовой «Наедине со всеми», во время которых педагоги откровенно рассказывают о себе. Так было и в этот раз. Мы узнали много нового об Ольге Арсентьевне — замечательном преподавателе, чутком, отзывчивом, щедром, но очень скромном человеке, заботливой дочери, любимой и любящей жене, матери, бабушке. Недавно О.А. Огородникова отметила юбилейный день рождения.

Много теплых слов по этому поводу высказали выпускники группы 41Н специальности «Начальное образование»:

– *Уважаемая Ольга Арсентьевна! Каждый проведенный Вами урок – это маленькая жизнь, интересная и познавательная.* Анна Свердлова и Дарья Черноок

– *Я не перестаю удивляться и восхищаться Вашей женственностью и независимостью...* Татьяна Мысливец

– *Уважаемая Ольга Арсентьевна, мы неоднократно убеждались в том, что Вы не только замечательный педагог, но и искренний человек, инициативный организатор. Ваша фантазия и неиссякаемая энергия не только поднимают всем настроение, но и дарят заряд бодрости и позитива.* Ирина Бычкова

– *Ольга Арсентьевна Огородникова – один из самых любимых наших педагогов. Все ее уроки наполнены не только интересной и полезной информацией, но и теплом, заботой, добротой и любовью.* Наталья Станюш, Инна Ежова

– *Ольга Арсентьевна – добрейшей души человек, красивая и загадочная женщина...* Оксана Климанская, Анастасия Бровка

Уважаемая Ольга Арсентьевна! Спасибо Вам за Ваш труд – такой нелегкий и бесценный, за мудрость и поддержку. Спасибо, что Вы есть, будьте счастливы, здоровы и любимы!

**Ольга ПАВЛОВСКАЯ, Елена ЮНЦЕВИЧ, выпускницы Полоцкого колледжа.**

МЫ і ЧАС
ГАЗЕТА ВДУ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА
Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі 27.10.2009 г. Рэг. № 747.

ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ імя П.М. МАШЭРАВА»

Адрас рэдакцыі: 210038, г. Віцебск, Маскоўскі пр-т, 33.
Тэл. 58-97-92. Эл. пошта: gazeta@vsu.by
Газета надрукавана афсетным спосабам
ва УПП «Віцебская абласная друкарня».
ЛП 02330/116 ад 27.03.2014 г.
Вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4, Віцебск, 210015.
Падпісана да друку 27.06.2016 г. у 15.30. Тыраж 940.
Аб'ём 1 друк. арк. Зак. 3744.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні неабавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі.
Газета выходзіць два разы на месяц.

Галоўны рэдактар І.М. ПРЫШЧЭПА
Рэдактар Н.П. ЛАЗЕБНАЯ